19 ліпеня выхаванцы аддзялення дзённага знаходжання інвалідаў прынялі ўдзел у IV міжрэгіянальнай спартакіядзе для людзей з абмежаванымі магчымасцямі ў г. Смаргонь. Дартс,  кідкі мяча ў кальцо, збіванне кегляў, стральба з пнеўматычнай вінтоўкі і іншыя віды былі ўключаныя ў спартакіяду. Каманда складалася з 4 удзельнікаў. Па выніках спаборніцтваў пераможцам стаў Андрэй Шаблінскі. Ён узнагароджаны кубкам, дыпломамі і прызамі. Усе ўдзельнікі ўзнагароджаны падарункамі. Дадому вярнуліся з добрым настроем і перамогай.







